Цэна асобнага нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: **Вільня, Віленская вул., № 29.**

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.— 4 р. на 6 мес.—2 р. 3 мес.—1 р. Перамена адрэсу— 20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнцыі, прысланые у рэдакцыю, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішчэ разам с фаміліей,, хто ня захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія тэлькі для ведама рэдакцыі. Рэдакцыя пакдае за сабой права папраўляць і укарачываць прысланые рукапісы і аўторам назад іх не звертае.

Год IX. 20 Лістапада 1914 г. № 46

*Усім, хто перад Новым Годам захочэ абзнаеміцца з „Нашай Нівай“, калі прышле свой адрэс, то кантора Рэдакціі будзе высылаць газэту да Новаго Году ДАРМА.*

## Хаурусная праца.

Тысячы—дзесяткі тысяч—сыноў Зямлі Беларускай праліваюць кроў сваю і чужую на вайне, гінуць ад куль і хвароб. Іншые калекамі вертаюцца да родных хат — няздольные да працы дзеля куска хлеба. А на ўвесь наш край ускладаецца вялікі ціжар: трэба пракарміць гэных калек, трэба даць падмогу і апеку ўдовам і сіротам пабітых на вайне...

Кажуць людзі: пасьля вайны будзе—павінна быць—лепей. Дай жэ Божэ, каб тое збылося! Але, чэкаючы нейкаго зміласаваньня, нейкаго цуду, нельга апускаць рук, нельга пакідаць тае работы, каторая тварыла і будзе далей тварыць новае жыцьцё.

Ніхто не ўзбагаціць нас без дай прычыны. Ніхто не асьвеціць цемры ў душах нашых, калі самі сьвету шукаць ня будзем. Гэта павінен ведаць і добра памятаць кожны беларус у часі звычайным, а тым болей цяпер.

Растуць падаткі, растуць нашы грамадзкіе павіннасьці. Прыходзіцца шукаць спосабоў дзеля здабыцьця патрэбных грошы. Як дайсьці гэтаго?

І тутака ізноў атчыняецца перад намі дарога, па каторай дайшлі багацьця і вышэйшай культуры гэтак падобные да нас народы: Латышы, зацісьненые багатырамі-баронамі чужой нацыі, чэхі, загубіўшые колішнюю цывілізацію і колішнюю славу, ірландцы, каторых дзержалі у зьдзеку і гнібеньні англійскіе лэнд-лорды, забраўшы ўсю зямлю, — ўсе гэтые «мужыцкіе» нацыі дайшлі лепшай долі супольнай, хаўруснай, ўсенароднай працай. Быўшые беззямельнымі йшчэ гэтак нідаўна латышы адваёвываюць цяпер нават вялікіе гарады, як, напрыклад, Рыга, Лібава і інш. Чэхі перад усім сьветам могуць пахваліцца сваім экономічным развіцьцем. Ірландцам даюць асобны сэйм (парлямэнт) і самоупраўленьне. І ўсё затым, што мужыцкая мільённая грамада збудзілася да жыцьця, што ўвесь народ жыў братнім жыцьцём, што адзін аднаму памагаў у працы, заводзячы ўселякіе хаўрусы дзеля супольнай работы, дзеля вызваленьня з бяды, с цемры безпрасьветнай.

Па гэткай дарозі павінны йсьці і мы—асабліва цяпер, калі вайна забірае ад нас гэтулькі ахвяр і людзьмі і дабром. Што яна руйнуе,—трэба тое адбудоўваць. Што забірае з дабытку — ізноў прыдбаць. І тутака сіл аднаго чэлавека не хапае. Трэ' йсьці ўсім грамадой, трэ' ўсей вёскай, ўсім сялом працаваць, каб не дапусьціць у нашы хаты няпрошэных гасьцей—голаду і холаду. Трэба завадзіць хаўрусы дзеля ўзаемнай падмогі—крэдытные банчкі, хаўрусные крамы, суполкі дзеля прадажы агулам свайго вясковаго багацьця, дзеля выпіскі і закупкі патрэбных тавароў і інш.

Дарога хаўрусоў—коопэрацііі—гэта ўжо выпрабаваная, пэўная дарога, каторая дае раскінутаму па вёсках і сёлах народу, раздзеленым сваркамі і звадкамі селянам-гаротнікам сілу і моц у здабываньні хлеба, у забеспечэньні і сябе і сірот ды ўдоў салдацкіх ад недастатку. Па ёй павінны мы пайсьці.

За апошніе гады пачалі гэткіе хаўрусы шмат дзе атк рывацца і ў нашай старонцы. І з іх бачылі мы чы мала карысьці?!. А йшчэ даюць нам добры прыклад коопэратывы ў Галіччыне украінскай, зруйнаваные цяпер вайной: тамака тры гады народ змагаўся з голадам толькі дзякуючы хаўрусам, бо тры гады неўрадзіла.

Ўсе сьведомые беларусы, ўсе добрые сыны сваей бацькоўшчыны павінны ў гэты цяжкі момэнт натужыць сілы свае, каб з'еднаць нашу мужыцкую грамаду дзеля супольнай экономічнай работы, дзеля змагьньня з бядою. Гляньмо, якую вялікую подмогу пацярпеўшым ад вайны даюць, напрыклад, маскоўскіе хаўрусы, злучэные у «союзъ московскихъ кооперативовъ»,—і ўбачым, што тая падмога йдзе нават нашай старонцы, надгранічным губэрням Літвы і Беларусі.

Трэба нам з іх узяць прыклад. Справа хаўрусоў у нас — дужа пільная, дужа патрэбная і дужа карысная.

---

# ВАЙНА.

18 лістапада Гасудар Імпэратар выехаў с Царскаго Села к дзействуючэй арміі.

Гасудар Імпэратар апавешчае Найвышэйшую падзяку глаўнаму начальніку Двінскаго ваеннаго округу, інжэнер-генералу князю Туманову, за працу і шчырую дбаласьць аб добрых парадках і баспечнасьці у часе падарожы Гасудара Імпэратара 21 кастрычніка—2 лістапада сёлетняго году ў дзействуючую армію,

---

### Расейска-Аўстрыяцкая.

Наступаньне расейскаго войска за Карпаты і к Кракову не спынялося праз увесь тыдзень. Пярэдніе атрады, прайшоўшы малы Лаборэц, занялі Гуменнэ на вэнгерскай раўніне. У заходней Галіччыне расейцы прыбліжаюцца к Кракову і занялі на прасьцягу 20—40 вёрст на ўсход ад яго цьверць паўкругу па фронце Прошвіцэ—Бжэско Старэ—Бохнія—Вісніч, аткінуўшы тут аўстрыяцкую армію і захапіўшы 7000 палонных з лішнім, шмат арудзій, кулемётаў і інш. ваеннай здабычы. У гэтым раёне, каб атакаваць сільна умацаваные аўстрыяцкіе пазыцыі на левым беразе Рабы, некаторые пярэдніе атрады расейскаго войска перахадзілі гэту рэчку у часе ледаходу у брод глыбінёю па грудзі. Асабліва заўзята баранілі аўстрыякі Бохнію, узятую расейцамі атакай на штыкі. Цяперака аўстрыяцкае войска, быўшае у Буковіне, с пасьпехам атступае. Расейцы ізноў занялі Чэрновіцы. Аўстрыяцкіе пазыціі, бараніўшые праходы ў Карпатах на працягу 50 вёрст, узяты расейцамі 15 лістапада пасьля дзесяцідзённай заўзятай бітвы. Як даносіць Штаб Верхоўнаго Глаўнокамандуючаго, за першую палавіну лістапада расейцы узялі у палон каля 50,000 аўстрыяцка-вэнгерскіх салдатоў і каля 600 афіцэроў.

### Расейска-Нямецкая.

Праз увесь мінуўшы тыдзень уся увага абядзьвух старон было скіравана найболей на вялікую і крываваю барацьбу паміж Віслай і Вартай. Былі мамэнты, што нямецкае войска праб'еццa праз распалажэньне расейцоў, а нават у адным мейсцы (на ўсход і паўдня ад Лодзі) і дасьцігла гэтаго, але само-ж папала у нявыгаднае палажэньне: расейскае войска немцоў акружыла, і цяпер яны ня ведаюць як з гэтаго выйсьці. 16 лістапада. Паміж Віслай і Вартай немцы утрымліваюць умацованую імі пазыцію Стрыков—Згеж—Шадэк—Здуньска Воля. Вельмі заўзятые бітвы адбываліся у раёнах Стрыкова і Згежа, прычым расейцы захапілі арудзіі і некольні сот палонных. Расейскае войска заўладала з бою фронтам Гловно—Белявы—Собота. 17 лістапада. Заўзятые бітвы не спыняюцца у напрамку к Ловічу. Проба немцоў прасунуцца ў раёне Шэрцова адбіта з вялікімі для іх стратамі. 18 лістапада. На левым беразе Віслы у раёне Ловіча 17 лістапада бітвы разьвіваліся на ўсім фронце, прычым атакі немцоў найбольш былі скіраваны на фронт Белявы—Собота. К поўначы ад Ловіча наступленьне расейцаў было карысна у раёне Лодзі. На левым крыле расейскаго распалажэньня выясьнено, што у напрамку ад Каліша к Серадзю зграмадзіліся немалые нямецкіе сілы. 17 лістапада непрыяцель пачаў наступленьне ад Серадзя і ў раёне Ласка пярэдніе атрады расейскаго войска ўступілі з немцамі у вельмі заўзятую барацьбу, якая не спынялася цэлы дзень. Пасьля бітвы, расейцы занялі Шэрцов.— На ўсходне-прускім фронце адбываюцца невялікіе бітвы. У раёне Мазурскіх азёраў і рэчкі Ангерап расейскае войска выцiснула немцоў на некаторых участках іх умацованых пазыцій.

У бітвах паміж Віслай і Вартай немцы панясьлі не малые страты, асабліва, калі ім прышлося атступаць ад Рзгова і Тушына цераз Бжэзіны к Стрыкову пры нявыгадных для іх варунках. З гэтай прычыны пашырыліся весткі, што немцы ужо разьбіты. На такую думку Глаўнае упраўленьне Генеральнаго Штабу апавешчае, што німа чаго ешчэ вельмі цешыцца, бо бітвы не спыняюцца. Хоць барацьба на ўсім фронце разьвіваецца для расейскаго войска зусім карысна, але праціўнік не пакідае заўзята супраціўляцца. Такім чынам барацьбы гэтай ня можна лічыць закончэнай, адно трэба чэкаць і верыць, што расейскае войска давядзе да канца пабеду над праціўнікам і да рэшты зломіць супраціўленьне ворага.

### Расейска-Турэцкая.

На пачатку тыдня штаб каўказкай арміі абвесьціў, што наступаньне турэцкаго войска ад Эрзерума адбіта і пагоня праціўніка закончэна. Прычым, у часе прасьледаваньня разьбітых турэцкіх сіл, расейцы захапілі шмат палонных, аружжа, яшчыкаў з набоямі і г. д. Паміж іншым штаб паведамляе, што дарога атступаньня туркаў была засеяна трупамі іх замёрзшых салдатоў. У апошнім часе вялікшых бітваў на гэтым фронце не чуваць.

### Француска-Англіцка-Бэльгійска-Нямецкая.

Тутака, апрача неспыняўшыхся заўзятых атак нямецкаго войска, каб прарвацца к берэгу каля Рэймса і каля Вэрдэна і апрача таго, што на ўсім гэтым фронце вываліў вялікі сьнег,—нічога важнаго не сталося.

### Сэрбска-Чарнагорска-Аўстрыяцкая.

З гэтаго поля крывавых змаганьнеў весткі надыйходзюць дужа скупа. Гэтак, ужо колькі часу німа ведама, што робяць аўстрыякі каля Белграду. На лініях распалажэньня войска праціўнікаў выходзіло, што аўстрыякі меціліся адрэзаць сэрбоў ад чорнэгорцаў і такім чынам разьбіць іх па асобку. Але гэта аўстрыякам не ўдалося. З апошніх вестак відаць, што ўсе атакі аўстрыякоў сэрбы і чорнагорцы адбілі.

---

**У Нямеччыне.** Немцы, як і аўстрыякі, відаць баяцца ўступленьня расейскаго войска, пасьпешна строюць украпленьня і траншэі з абядзьвух старон Нёману. Атправілі 150 арудзій у Данціг, 40,000 войска с Франціі у Брэслаўль і 75 арудзій у Краков.—Да гэтаго часу у Нямеччыне паклікана на вайну 4 с палавінай мільёнаў, узростам ад 18 да 45 год. Газэта «Times» пішэ, што немцы рыхтуюцца к доўгай вайне. Прымусіць іх к здачы голадам немагчыма. У іх не хапае можэ быць пшаніцы, але за тое другіх прыпасаў шмат, асабліва бульбы. «Бадай ці зможэ іншая якая небудзь нацыя у Эўропе—пішэ газэта—быць спасобнай вясьці так нарыхтовано гаспадарку, як гэта можна заўважыць цяпер у Нямеччыне».

**Аўстрыя і Румынія.** Граф Тісса, першы міністр Вэнгрыі, высказаў; што «у разе пабеды Масквы, Константынопаль зрабіцца расейскім, а Румынія аберніцца у расейскую провінцію», і асьцерэгае вэнгерскіх румыноў перад доляй «нешчасных румынаў Бесса-

траградзкае гарадзкое самаупраўленьне облічыла расходы на устройство у Петроградзе лазарэтоў на 30 тысяч хворых і раненых ваякоў, з расходам на утрыманьне іх у 17,998,558 руб. Савет міністроў, разгледзіўшы гэту смету, прызнаў яе і пастанавіў на першы пачатак цяпер-жэ атпусьціць гораду 3 мільёны руб.

**«Чырвоны Крыж»** ад пачатку вайны меў расходу на ўсе свае установы па догляду і лячэньню хворых і раненых ваякоў 12,704,637 руб. 63 к., на гэта зложылася прыватных ахвяр 3,458,525 р. На тэатры вайны працуюць ад «Чырвонаго Крыжу»: 70 госпіталяў, 64 этапные лазарэты, 22 пярэдніе атрады, разшырэные на 28,000 ложкаў з лішнім. У лекарска-санітарных установах яго працуе 696 дактароў, 2,169 сёстраў міласэрдзя і 8,000 санітароў. 4521 сёстраў міласэрдзя перададзена ў лекарска-санітарные установы ваеннаго ведамства.

**Студэнты ратнікі апалчэньня** першаго разраду да прызыву не належуць.

**Запамогі няшлюбным жонкам.** Вярхоўная рада па догляду сем'яў пакліканых на вайну, а такжэ раненых і забітых ваякаў пастанавіла загадаць установам, якіе займаюцца доглядам, зьвярнуць асаблівую увагу на саманайпершае аказываньне помачы няшлюбным сем'ям, пасынкам, падчэрыцам і «прыёмышам» (выхаванцам).

**Павышэньне акцызу.** Абвешчэна аб павышэньні с 15 лістападу акцызу на цукер, карасіну, дрожджы, запалкі, папіросные гільзы і паперу, а такжэ падвышэны налог на зямлю, дамы, кватэры, тарговые і прамысловые прадпрыняцьця, гэрбавы збор і інш. Абвешчэна налогі с пасажыраў, пасажырскаго багажу, а такжэ с первожаных па чыгунках грузоў (пасылак) вялікай і малай пасажырскай скорасьці.

**Рэквізыцiя стручковаго (турэцкаго) перцу.** Па загаду вышэйшых уласьцей петроградзкі градоначальнік загадаў паліціі зараз-жэ даведацца гдзе і колькі ёсьць стручковаго перцу, пасьля чаго рэквізаваць перэц, ня гледзючы на тое колькі яго знойдзецца.

Забарона. Пад штрафам да 500 руб. або арышту да 3-х месяцоў, забараняецца кундуктарам Паўночна-Заходняй чыгункі прыймаць і перавозіць прыватную карэспандэнцію (пісьмы і інш.).

**Абавязковая пастанова.** Адэскі генерал-губэрнатар абавязаў усіх шаўцоў па установленых цэнах шыць боты для войска. Шаўцы, не захацеўшые патчыніцца гэтаму, будуць высланы, як праціўнікі патрэбоў арміі.

**259 п'яных у адзін дзень.** Аж гэтулькі у нашы «цьвярозые» часы злоўлена у Петроградзе у адзін дзень (10 лістапада) і засаджэна пад арышт бедных паклоннікоў алькаголю.

**Аб багажы.** Расейскі камітэт у Стокгольме апавешчае усіх, згубіўшых свой багаж у дарозе паміж Нямеччынай, Швэціей і Расеей, што яны могуць навесьці спраўкі ў расейскім камітэце ў г. Стокгольме, паведаміўшы № квітанціі багажа. Адрэс канцэлярыі камітэту: Швэція, Стокгольм, отэль «Контіненталь» № 115.

**За зьбіраньне ахвяр на нямецкі** флот нямецкімі падданымі у Петраградзе цягнуць к атвету шмат асоб, спаміж каторых большая часьць займае высокае становішчэ у Петроградзе.

**Конфіскація.** Як пішэ «Русск. Слово» урад пастанавіў конфіскаваць на казну родовые маёраты (двары) прыбальційскіх памешчыкоў, каторых радня ваюе ў нямецкай арміі.

**Забарона.** У Пскове абавязываючай пастановай забаронена на вуліцах гаварыць па нямецку.

**Зносіны с Турэччынай** спынены, так што ужо почта ніякіх туды атправак (пасылак, пісьмаў і інш.) не прыймае.

**Справа дэпутатоў с.-д.** На пачатковым следзтве аб асобах, зьехаўшыхся непадалёк ад Петраграду з розных мейсцоў на нараду з некаторымі членамі-большэвікамі соціал-дэмократычнай фракціі Г. Думы, выкрыта, што нарада велася аб праекце рэзолюціі (пастановы) с прычыны вайны, у якім прызнаецца «найменьшым злом пабеду над Царскай Манархіей і яе войскам» і ставіцца абавязкам «усестароньняя, пашырэная на войска і на тэатры ваенных змаганьнёў, пропаганда (шырэньне) соціалістычнай рэволюціі» і організація (наладжэньне) для такой пропаганды нелегальных ячэек (гурткоў) у войску». Усе затрыманые асобы, па загаду судоваго сьледчаго, зачынены пад стражу.

**Прафэсар Бадуэн-Куртэнэ.** С прыгавору судовай палаты, надовечы засаджэна у Петраградзе у Выборгскую турму («Крэсты») прафэсара Бодуэн-дэ-Куртэнэ. Засуджэны ён за сваю кніжку «Національный признак в автономіи».

**У Фінляндзіі.** Быўшы прэдседацель фінляндзкаго сэйму Свінхувуд, не паслухаўшы пастановы генерал-губэрнатара аб атпрэччыне ад службы, арыштован па загаду Выборгскаго губэрнатора і высылаецца на час вайны у Томскую губэрню.

**У Польшчы.** С прычыны вайны спынена у Польшчы да асабліваго загаду узысківаньне падаткаў, налогаў і інш. збораў на казну.— Як падлічэна—патрэбна для Польшчы атрымаць да вясны 200 тысяч коні, на пакупку якіх польскі грамадзянскі камітэт стараецца аб пажычку 80 мільёнаў руб.— Агульная лічба уцёкшых да Варшавы была 82,000, у тым 70,000 палякоў і 12,000 жыдоў. З атступленьнем немцаў гэтые лічбы зьменшыліся.—Радомскіе гмінные (валасные) ўласьці атрымалі загад наладзіць варту тэлеграфных і тэлефонных праводоў. Непаслухаўшые гэтаго загаду будуць аддавацца пад ваенны суд па 170 ст., што гразіць карай сьмерці.— Камэндант Лодзі загадаў, каб магазыны былі атчынены цэлы дзень.—У Варшаве ад бомбаў было пару ўзрываў, параніўшых колькі людзей. Аднэй бомбай з нямецкаго самалёту пабіты шыбы ў доме Амэрыканскаго консула.— Немцы захапілі у палон Варшаўскаго губэрнатора барона Корфа, які выехаў быў на аўтомобілі агледаць пацярпеўшые ад вайны паветы.

# Аб усім па троху.

**Аб пачатковым хатнім навучаньні па вёсках.** У 1874 г. выдано права аб пачатковых народных школах. (Свод Законоў, Т. XI, ч. 1, ст. 346—3511). У 1882 г. адно земство зьвярнулася с просьбай да міністэрства асьветы, каб гэта апошняе заапековалося хатнім навучаньнем пачатковай граматы сярод вясковых жыхароў праз асобы, не маючые на гэта вучыцельскаго званьня. На гэту просьбу міністэрство асьветы за згодай міністэрства ўнутрэньніх справоў і обэр-пракурора св. Сыноду выдало 14 лютаго 1882 г. цыркуляр, у якім прызнае за патрэбнае: 1) выясьніць, што ад асобаў, займаючыхся пачатковым хатнім навучаньнем (граматай) па вёсках не канечна вымагаць вучыцельскае званьне (цэнз) і 2) прэдаставіць мейсцовым паліцейскім і валасным ўласьцям, а такжэ і агульным і духоўным прыхадзкім даглядам над гэтым, каб хатнім навучаньнем не займаліся асобы «не благонадзёжные». На аснове такога выясьненьня па ўсіх вёсках пачатковым навучаньнем чытаньня і пісаньня мае права займацца кожны без асабліваго на гэта пазваленьня і не канечна патрэбна мець якоеколечы вучыцельскае сьвядоцтво. Вымагаецца толькі (і то ўжо вучучы) палітычная і маральная благанадзёжнасьць. Цыркуляр гэты надрукованы у расейскім выдавецтве — «Фальборк і Чернолускій. Народныя училища». (Спб. 1903 г., 11 стр.).

**Колькі адбываецца войнаў?** Разам с турэцкай ідзе цяпер 18 войнаў. Ваюе 10 дзержавоў: з адной стараны Расея, Англія, Франція, Бэльгія, Японія, Сэрбія і Чорнагорыя; з другой—Нямеччына, Аўстрыя і Турэччына. Расея, Англія, Франція і Бэльгія вядуць па тры вайны: з Нямеччынай, Аўстрыей і Турэччынай. Японія, Сэрбія і Чорнагорыя—па дзьве: з Нямеччынай і Аўстрыей. Нямеччына і Аўстрыя вядзець па сем войнаў: з Расеяй, Англіеў, Франціей, Бэльгіей, Японіей, Сэрбіей і Чорнагорыей. Турэччына вядзе 4 вайны: з Расеяй, Англіей, Франціей і Бэльгіей.

Адна з француcкіх газэт недаўна падлічыла, што вайна абхапіла 69 прац. насяленьня Эўропы, а ва ўсім сьвеце 890,000,000 людзей або 53 прац. насяленьня ўсей зямлі. Цяперака з выступам Турэччыны лік ваюючаго насяленьня яшчэ болей павялічыўся.

Рэдактар-Выдавец

І. Луцэвіч.


**Прыймаецца падпіска на 1915 год па беларускую газэту**

## „НАША НІВА“

**ГОД ВЫДАВЕЦТВА X.**

«НАША НІВА» як і тые гады будзе працаваць над адраджэньнем Беларусі, шырыць беларускую сьведомасць, бараніць інтэрэсоў гаротнаго беларускаго народу.

«НАША НІВА» у публіцыстычным аддзелі друкуе стацьці на палітычные, экономічные і національные тэмы, лепшых беларускіх публіцыстоў; у бэлетрыстычным аддзелі дае апаведаньні, сцэнічные творы і вершы, лепшых бэлетрыстоў і паэтоў. Апрача гэтаго дае многа вестак з жыцьця на Беларусі і з усіх старон. У вясковым жыцьці «НАША НІВА» заменяе сабой штодзенную часопісь.

Цэна «НАШАЙ НІВЫ» на год с перасылкай—2 р. 50 кап.; на поў года—1 руб. 25 кап; на 3 месяцы—65 к.; на 1 м. 25 к.

*Пробные нумэры высылаюцца дарма.*

**Усе, каму дорага справа адраджэньня беларусоў да культурна-національнаго жыцьця, выпісывайця, чытайця і шырця „НАШУ НІВУ“.**

Адрэс рэдакціі: **Вільня, Віленская 29.**

Рэдактар-Выдавец **І. Луцэвіч.**



Выйшоў з друку

## „БЕЛАРУСКІ КАЛЕНДАР“

## на 1915 год.

двумя асобнымі выданьнямі, з асобным тэкстам рускімі літэрамі і з асобным тэкстам лацінскімі літэрамі.

**Цэна календара:**

| Чысло экзэмпл. | без перасылкі | с перасылкай | накладной плат. | уступка | з уступк. с перас. | з уступкай з накл. плат |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 10 | 16 | 36 | — | 16 | 36 |
| 2 | 20 | 30 | 50 | — | 30 | 50 |
| 3 | 30 | 50 | 70 | -- | 50 | 70 |
| 4 | 40 | 64 | 84 | 5 | 59 | 79 |
| 5 | 50 | 70 | 90 | 10 | 60 | 80 |
| 10 | 100 | 135 | 155 | 20 | 115 | 135 |
| 20 | 200 | 245 | 265 | 40 | 205 | 225 |
| 30 | 300 | 365 | 385 | 60 | 305 | 325 |
| 40 | 400 | 465 | 485 | 80 | 385 | 405 |
| 50 | 500 | 580 | 605 | 100 | 480 | 505 |
| 100 | 10,00 | 11,60 | 11,80 | 3.00 | 8,60 | 8,80 |

**Выпісываць з „Беларускай Кнігарні“**

**Вільня Завальная № 7.**

Кнігарня просіць прысылаць заказы на календар загадзя, бо у гэтым гаду на палавіну меней друкавана календара і ён хутка разойдзецца.

*На пробу календары не высылаюцца.*



## „БЕЛАРУСКАЯ КНІГАРНЯ“

*Вільня, Завальная вуліца № 7.*

**Мае на продаж на складзе:**

**Карскій** «*Бѣлоруссы*» введеніе въ изученіе языка и народной словесности . . . . . . . . . . . . . . . . . . 2,25 к.

**Романовъ**—*Бѣлорускій сборникъ.* Выпускъ восьмой и девятый. Бытъ бѣлорусса. Словарь условныхъ языковъ . . . 3,50 к.

**Сержпутовскій**—*Сказки и разсказы бѣлорусовъ-полешуковъ* . . . 1,00 к.

**Бѣлорусскій архивъ древнихъ грамотъ.** Ч. 1-я (единственная). Изд. І. Григоровичъ. М. 1824 г. . . . . . . . 3,00 к.

**Западнорусскія лѣтописи** . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3,00 к.

**Страсти Христовы** въ Западно-Русскомъ спискѣ XV в. (Даслоўны перадрук у старо-беларускай мове). . . . . 1,00 к.


Друкарня Марціна Кухты, Татарская 20.